БЕЛАРУСЬ НА ЗЫХОДЗЕ ДЗЕВЯНОСТА ПЕРШАГА

Гасцініца „Беларусь” у Мінску (замежнікам на прыватным пашпарце 20 долараў за суткі), пасля знятужлівага падарожжа з Беластока, прывітала нас мардабоем. У холе гасцініцы двух хуліганаў адабрала ў міліцыянера дубінку і адлупцавала яго так, што аж крывёю заліўся.

— Ці часта ў вас такое тварыцца? — пытаем у вахцёршы.

— Не, у нас такога не бывае, гэта першы раз.

У Мінск паехалі ўчатырох. Усе журналісты. Тэарэтычна афармленне выезду за ўсходнюю мяжу Рэчы Паспалітай штораз болей ускладняецца. Прапускны пагранічны пункт у Кузніцы, як і іншыя, усё зацiскаецца і зацiскаецца. Беларусы сцерагуць, каб іхні тавар не ўцякаў у торбах турыстаў-гандляроў у суседнюю капіталістычную Польшчу. Мяжа адчынена ўсяго для службовых, ці ў сямейных справах, падарожжаў. Як будзе ў дзевяноста другім — невядома. На практыцы ж выехаць у Беларусь не так ужо і цяжка. Палітычная свабода паспрыяла там узнікненню і легалізацыі шматлікіх, між іншым і маладзёжных, суполак, аб’яднанняў, таварыстваў. Запрашэнне ад адвольнай такой установы — падстава для службовага падарожжа. Наша запрашэнне складалася, бадай, ці не з адной фразы: „Дарагія сябры, прыязджайце!”

З білетам у Мінск у беластоцкіх касах клопат — выкупленыя наперад. Трэба браць у Гродна, а далей як пападзе. У крайнім выпадку, як і я зрабіў, можна білет набыць у цягніку, у кандуктара — ад Беластока да мяжы, далей яго ўжо маё падарожжа не цікавіць, канчае працу.

Як з Гродна ў Мінск даехаць? Вось пытанне. Можна, і гэта самае хуткае выйсце, на таксі. На стаянцы, як ні глядзі, даўно ўжо рынкавыя адносіны. У першай дэкадзе снежня плацілася там яшчэ рублямі — ад 800 да 1000. На колькі старгуеш, столькі ж заплаціш. Замежніка знюхаюць з пер-

шага пагляду ды дзяруць без спагады — торг кароткі: не, то калі ласка пехатою. Звярыны твар капіталізму.

Бывае, што гродзенскі таксіст сустракае на трасе свайго мінскага калегу, які шпарыць у адваротны бок — абменьваюцца пасажырамі ды ашчаджаюць сабе палову дарогі, бензіну і часу. Сапраўдныя мафіёзі.

У Мінск даязджаем на змроку. Горад робіць зразу каласальна-прыгнятальна-адпіхальнае ўражанне — ніякіх прыгарадаў, у адзін момант страляе ў неба сцяна бетону. Вось і Мінск. Уладкаваўшыся з начлегам, туляемся па горадзе ў пошуках, дзе б тут павячэраць. Павячэраць можна толькі ў рэстаране, а там народам набіта, няма месцаў. За намі шаснаццаць гадзін падарожжа. „Да Мінска трэба прызвычаіцца, каб яго палюбіць", — захоўвае добры настрой мой рэдакцыйны калега. Ні мне, ні іншым гэты настрой не ўдзяляецца. Мы не ўяўляем сабе затое, як тут жыць можна — забылі пра тое, што і ў нас былі чэргі, бракавала падставовых прадуктаў. Зараз Беларусь у такім стане — замарожаныя цэны, талоны дый церпіць на дадатак ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў суседняй Літве ці Украіне, якія пайшлі па шляху лібералізацыі. Тавар туды адплывае. Але ж жывуць людзі ў Беларусі. Мала таго, у агалочанай Масковіі Беларусь явіцца як краіна такога-сякога дабрабыту. Нічога дзіўнага, што Расія так напорыста гне і Беларусь, і Украіну да ўсялякіх саюзаў і садружнасцяў. Без іх ёй не выжыць, канец з ёю.

Вярнуся да вячэры. Асталіся б мы галодныя, няйначай, каб не пару долараў, якія заўсёды з сабою мець трэба. З імі лягчэй у рэстаране дзверы адчыняюцца. Быў гэта наш найвялікшы выдатак таго вечара. Пазней, калі вярнуўся гумар, ганяліся падземкай. Сваёю падземкай Мінск можа пахваліцца перад усім светам. Не то, што ў Варшаве, дзе ўсё будуюць, і не то, што ў Рыме ў час сусветнага чэмпіянату, дзе пацукі, ад людзей не тоячыся, эстафетай браліся навыперадкі.

Аднаго вечара развітаўся я з сябрамі, бо задумалася мне наведаць знаёмых, якія пераехалі з Мінска ў Вільню, у незалежную Літву. Перасцерагалі мяне, што будуць дзве мытні па дарозе, дык на ўсялякі выпадак яшчэ раз з сябрамі разві-

таўся. Аказалася аднак, што цягнікоў мытні яшчэ не датычаць. Увесь мой клопат пачаўся, калі трэба было вярнуцца з Вільні, абы-куды, каб толькі вярнуцца. У касах „Інтурыста" білетаў у Польшчу звычайна няма. Перад касамі мафіёзі, якія за долары гэтымі ж білетамі гандлююць, але на дватры дні наперад, а на гэты сам дзень няма. Схадзіў я ў польскае пасольства, шукаючы там падтрымкі, нібыта, калі не выеду, выпуск газеты сарвецца. У нічым не могуць дапамагчы, маўляў, білеты ў касах альбо ў мафіёзі. Адно, што атрымаў я ў пасольстве гэта газета „Кур'ер віленскі", у якой прачытаў, што немагчыма ў Вільні купіць білет у Польшчу. Пагнаўся я на аўтобусны вакзал, дзе з дапамогаю знаёмага (там жа па-літоўску гаварыць трэба) удалося дастаць білет у Гродна.

Каля аўтобуснага вакзала ў Вільні стаянка — „Таксі ў Польшчу". З цікавасці даведаўся цану. Перапалоханы прапановаю таксіст, закрычаў: „Сто шэсцьдзесят долараў!" А пайшоў ты нахер, летувісе адзін, я з Рыма ў Варшаву толькі сто пяцьдзесят заплаціў.

Аўтобус едзе амаль пяць гадзін. Па дарозе сапраўды дзве мытні: літоўская і беларуская. На шчасце дакументаў не правяраюць — меўся б я тады са сваім падарожжам у незалежную Летуву...

На гродзенскай мытні сустракаю паўпрытомных сваіх беластоцкіх сябрукоў — яны таксама вяртаюцца, з Мінска. Праз мытню хацелі мы прайсці службовым уваходам. Адтуль нас адсадзілі ў чаргу. Але нейк так сталася, што зноў аказаліся мы наперадзе. Гэта так знервавала функцыянераў, што ўзяліся за нас. Ператраслі дакладнюсенька. Шукалі зброю, долары, золата, наркотыкі... Як у агентаў ЦРУ. Кажу вам.

„Ніва" н-р 52 (1859) ад 29 снежня 1991 г.

СВАБОДНАЯ ПРЭСА Ў БЕЛАРУСІ

Калі гродзенцы ахвяравалі ў падтрымку сваёй незалежнай мясцовай газеты „Пагоня” 170 млн. рублёў, рэдакцыя прапанавала ўсім, хто ўзнёс больш за 50 долараў, дармовую рэкламу на сваіх старонках. Пасля гэткай прапановы фірмы і іхнія дырэктары запрапанавалі рэдакцыі яшчэ большую датацыю — каб толькі прозвішчы і назвы ахвярадаўцаў не з’явіліся ў беларускім незалежным друку...

Такая вестка прагучала 1 лютага г.г. у Беластоку ў час нарады Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча — Беларусь”, у ходзе якой рэдактары апазіцыйных выданняў знаёмілі з сітуацыяй незалежнай прэсы ў Беларусі.

Ніжэй прыводзіцца гутарка з Ігарам Гермянчуком — галоўным рэдактарам мінскай газеты „Навіны”, якая ўзнікла пасля забароны гаспадарчым судом газеты „Свабода”.

— Як тэхнічна адбылося выкананне пастановы гаспадарчага суда аб забароне газеты „Свабода”?

— Рашэнне аб забароне „Свабоды” было прынята за пятнаццаць хвілін і нумар, які мы падрыхтоўвалі на раніцу наступнага дня не павінен быў выходзіць — у адпаведнасці з рашэннем, якое ўступала ў сілу з моманту прыняцця. Нумар гэты аднак выйшаў у свет і мы ў ім паспелі паведаміць грамадскую думку, што наша газета забаронена. Наступнага дня пасля рашэння суда ў друкарню і дзяржаўную службу распаўсюджвання паступіла распараджэнне суда аб забароне „Свабоды”. Такім чынам легальны шлях друкаваць „Свабоду” і яе распаўсюджваць закрыўся. Безумоўна, мы маглі знайсці магчымасць выдаць газету падпольна. Мы аднак разумелі, што наступяць санкцыі, пасля якіх не зможам ужо займацца сваёй прафесійнай дзейнасцю. Таму выбралі мы легальны шлях — рыхтаваць выданне пад новаю назвай. Адначасна мы падалі апеляцыю на рашэнне аб забароне „Свабоды”. Лічу, што пакуль можна трэба скарыстоўваць легальны шлях выпуску незалежнай газеты — легальны друк шырэй даступны.

— Якія меры маюцца ў руках адміністрацыі, што яна ў змозе ўплываць на незалежную прэсу ў Беларусі, уключна з закрыццём газеты?

— Закрыццё газеты — гэта абсалютна апошняя мера. Але ж, усе друкарні ў краіне, якія могуць друкаваць газеты — належаць дзяржаве. Можна, у сувязі з гэтым, загадаць друкарні не друкаваць канкрэтную газету — мусіць яна пераехаць за мяжу. Другое — гэта забараніць распаўсюджваць газету. Альтэрнатыўныя (недзяржаўныя) структуры распаўсюджвання прэсы існуюць толькі ў Мінску ды маламагутныя яны. Наступная мера — гэта ціск з дапамогаю пракуратуры і іншых праваахоўных органаў. У прыватнасці, супраць нашых публікацый у „Свабодзе" ўзбуджана некалькі крымінальных спраў. Ну, уявіце сабе, што над вамі вісяць дзве крымінальныя справы — адна з іх „за паклёп на прэзідэнта", за што пагражае да пяці гадоў турмы. Гэта таксама свайго роду ціск — дзяржава паказвае, што можа цябе пасадзіць за краты.

— Газеты ў Польшчы выжываюць перш за ўсё за кошт рэкламы. Як гэта справа выглядае ў Беларусі і, канкрэтна, у выпадку „Навінаў"?

— Сітуацыя ў нас такая, што рэкламадаўцаў наогул стала менш, а па-другое — рэкламадаўцы ў цяперашніх умовах баяцца даваць рэкламу ў апазіцыйную прэсу. Яны разумеюць, што калі рэкламу гэту заўважыць улада — у рэкламадаўцаў будуць праблемы. Праблемы гэтыя перавысяць спадзяваную ад рэкламы карысць. Рэкламадаўцы звычайна баяцца, а мы — мусім выжываць выключна за кошт чытача. „Свабода" была акупнаю газетай ды прыносіла нават невялічкі прыбытак, які даваў нам магчымасць развівацца. Перад намі цяпер задача такая: вырабляць высакаякасны тавар, за які чытач будзе гатовы заплаціць даволі вялікія грошы, бо рэклама ў суме нашых даходаў складала толькі 5 працэнтаў.

— Развіццю свабоднай прэсы не спрыяе і тая акалічнасць, што цана афіцыйнай урадавай газеты заніжаная. Які сёння рэальны кошт выпуску газеты ў Беларусі?

— Рэальны кошт газеты, як нашай, у восем палосак —

прыблізна 10 цэнтаў. За гэтую цану мы мусім яе прадаваць. Калі меркаваць па газетнай плошчы, дык цана дзяржаўнай газеты ў 4-5 разоў ніжэйшая. Але мы, як я ўжо адзначыў, бярэм іх якаснасцю інфармацыі.

— У вашым дакладзе прагучала паражальная для мяне вестка, быццам у Беларусі магчыма забараніць Інтэрнэт. Ці сапраўды ў сённяшніх умовах можна адгарадзіць краіну ад інфармацыі?

— У Беларусі, безумоўна, гэта магчыма. У нас працуе маса правайдэраў (пастаўшчыкоў інтэрнэтавых паслуг — А. М.), але адзіны выхад на глабальную сетку — толькі праз дзяржаўную фірму. Такім чынам, калі правайдэр нечым дзяржаве не спадабаецца — яго вельмі лёгка пазбавіць выхаду на гэтую глабальную сетку. Правайдэр гэтага сапраўды баіцца і мусіць паводзіць сябе так, каб не выклікаць незадаволенасці з боку ўлады, бо тады ягоны бізнес будзе прыкрыты. Як гэтая сістэма страху спрацоўвае на практыцы, было відаць на прыкладзе „Свабоды". Пасля некарыснага для газеты рашэння суда, правайдэр, які паказваў яе ў Інтэрнэце, адмовіўся рабіць гэта надалей. Мы мусілі аператыўна шукаць новага правайдэра, які паказаў бы „Навіны". Справа выглядае так, што Лукашэнка фактычна кантралюе ў Беларусі Інтэрнэт.

— Дзякую за размову.

Гутарыў **Аляксандр Максімюк**

„Ніва" н-р 9 (2181) ад 1 красавіка 1998 г.

БЕЛАРУСЫ ВЫБІРАЛІ

Выбары ў Палату прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь ды рэспубліканскі рэферэндум па змяненнях у канстытуцыю, якія дадуць прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку магчымасць трэці раз кандыдаваць на гэты пост, працягваліся шэсць дзён. Адразу ж трэба сцвердзіць, што па важнасці рэферэндум апярэдзіў выбары дэпутатаў. Ва ўсіх афіцыйных паведамленнях

і на плакатах рэферэндум абавязкова выступаў на першым месцы. Па словах старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Лідзіі Ярмошынай, калі б гэтага рэферэндуму не было, яго трэба было б прыдумаць. Яна яшчэ адзначыла, што рэферэндум паспрыяў кансалідацыі беларускага народа.

Апошнія два дні датэрміновага галасавання і дзень выбараў правёў я ў 100-тысячным раённым Маладзечне і з гэтай перспектывы кансалідацыя не падалася мне такой відавочнай.

Беларускія выбары вонкава моцна адрозніваюцца ад нашых. Першая розніца заключаецца ў строгай рэгламентаванасці выбарчай кампаніі. Сустрэчы з выбаршчыкамі можна праводзіць толькі ў вызначаных месцах. У выпадку Маладзечна гарадскі выканаўчы камітэт адмысловай пастановай вызначыў дзеля гэтай мэты Дом культуры чыгуначнікаў, Палац культуры ды Цэнтральную гарадскую бібліятэку. Кандыдату ў дэпутаты са сваімі выбарчымі расходамі трэба было ўкласціся ў 950 тыс. рублёў (450 дол. ЗША) — такая сума была яму выдзелена з дзяржаўнага бюджэту ды знаходзілася на рахунку акруговай выбарчай камісіі, якая і плаціла за ўсякія расходы кандыдата, прыкладна, выбарчыя лістоўкі. Названая сума — ва ўмовах 100-тысячнага горада — аказалася сціплай, бо кампаніі ў нашым разуменні гэтага слова не адчувалася. Па горадзе віселі толькі дзяржаўныя плакаты з абвесткай пра выбары і рэферэндум, а па выбарчых участках — афіцыйная інфармацыя пра кандыдатаў ды іхнія фоткі. Маладзечанскія кандыдаты сваю персанальную кампанію засяродзілі на лістоўках, якія раздавалі на вуліцы, падкідалі ў паштовыя скрыні ў пад'ездах, або вешалі па выбарчых участках. У Маладзечне кандыдатаў у дэпутаты аказалася пяць — Эдуард Баланчук ад Беларускага Хельсінскага камітэта, Станіслаў Гаварушкін (дэпутат уступаючага склікання Палаты прадстаўнікоў), Аляксей Кароль ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, Вольга Лагвіновіч ад Партыі Беларускага народнага фронту ды мэр горада Маладзечна Мікалай Чурсін. Чатыры першыя кандыдаты вызначыліся беларусамі, М. Чурсін — расіянінам.

Па словах старшыні Акруговай выбарчай камісіі ў Маладзечне Міхаіла Фралянкова, гэтых пяць кандыдатаў уяўляла

тры палітычныя сілы. У час датэрміновага галасавання ў Беларусі можна праводзіць палітычную агітацыю — выбарчая цішыня накладаецца толькі на апошні дзень галасавання, хаця і тут ёсць асаблівасці. Матэрыялы, якія кандыдат або ягоныя давераныя асобы павесяць у памяшканні выбарчага ўчастка ў „датэрміновы" перыяд, у дзень выбараў не здымаюцца.

Усё ж, больш увагі ў Беларусі прыдавалася канстытуцыйнаму рэферэндуму. Беларуская апазіцыя выступіла супраць яго („Скажы Лукашэнку не"), але — па словах Андрэя Асмалоўскага ад Беларускага Хельсінскага камітэта, з якім мы назіралі за падлікам галасоў на адным з участкаў — асаблівая кампанія па гэтым пытанні не праводзілася. Кампанія такая праводзілася затое з боку адміністрацыі — на выбарчым тыдні ў паштовыя скрыні беларусаў трапіла больш за 860 тыс. (па выхадных даных) спецвыпуску газеты „Советская Белоруссия" з пасланнем А. Лукашэнкі да народа, у якім ён заклікаў ухваліць канстытуцыйныя змены. Па меркаванні апазіцыі, экземпляраў гэтых магло быць і больш за тры мільёны, дык пасланне тое мела шанц атрымаць кожная беларуская сям'я. У спецвыпуску А. Лукашэнка прадстаўляецца як добры селянін, харошы вайсковец, любіцель спорту — агулам: гарант стабільнасці і прагрэсу ў Беларусі.

Пяць маладзечанскіх кандыдатаў у дэпутаты аказаліся „стабільнай" групай, чаго нельга сказаць, напрыклад, пра Мінск, дзе асабліва моцныя кадравыя ўроны закранулі Партыю БНФ. Літаральна за два дні да выбараў са спіска кандыдатаў „знялі" намесніка старшыні гэтай партыі Аляксея Міхалевіча — была гэта першая вестка, якую завучыла падляшская еўрадэпутатка Барбара Кудрыцкая пасля свайго назіральніцкага прыезду ў Мінск. А. Міхалевіча абвінавацілі ў незаконным выпуску лістовак (без выхадных даных). Паводле ж самога „скасаванага" кандыдата, лістоўкі былі падробкай ды няўдалай — у нядоўгім беларускім тэксце было больш за дваццаць памылак.

Беларускія ўчасткі ў дзень выбараў гучаць музыкай, працуюць у іх буфеты, можна пад'есці, а нават і выпіць чарку. Паколькі многа супярэчлівасцей сярод назіральнікаў спараджала пытанне бяспекі бюлетэняў датэрміновага галасаван-

ня, дык у нас — замежных назіральнікаў і карэспандэнтаў — было спадзяванне, што тая галоўная скрыня, у якую выбаршчыкі кідалі бюлетэні 17 кастрычніка, выявіць праўду пра сімпатыі беларускага грамадства. Па чыста візуальным уражанні на маім 23-м маладзечанскім участку скажу, што рэферэндныя сімпатыі раскладаліся з нязначнай толькі перавагай у карысць прапанаваных А. Лукашэнкам зменаў, без яскравых дыспрапорцый паміж „за" і „супраць". Наступнага дня афіцыйныя вынікі такое ўражанне пацвердзілі — у датэрміновым і тэрміновым галасаванні А. Лукашэнку падтрымала 64% маладзечанскіх выбаршчыкаў. Дэпутатам у горадзе стаў у першым туры М. Чурсін (53%).

„Ніва" н-р 43 (2528) ад 24 кастрычніка 2004 г.

КАМУНІКАТ